# Людзі беларускай зямлі: Пётр Лысенка – высакароднасць дум і спраў

УДК 902:001-051(476)(092)



**Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік**

Аляксандр КАВАЛЕНЯ. Людзі беларускай зямлі: Пётр Лысенка – высакароднасць дум і спраў. У артыкуле на прыкладзе апантанай навукова-археалагічнай працы доктара гістарычных навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь П.Ф. Лысенкі асвятляецца навукова-даследчая дзейнасць вучоных-археолагаў, раскрываецца іх самаадданая шматгадовая праца, накіраваная на вывучэнне вытокаў беларускай дзяржаўнасці, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны і папулярызацыю ў грамадскім асяроддзі ўнікальных старонак нацыянальнай гісторыі.

Ключавыя словы: археалогія, гісторыка-культурная спадчына, беларуская дзяржаўнасць, гістарычныя даследаванні, музей, нацыянальны здабытак.

Aliaksandr KAVALENIA. People of the Belarusian land: Piotr Lysenko – dignity in thoughts and deeds. By the example of the dedicated scientific and archaeological work of Doctor of History, Laureate of the State Prize of Belarus Piotr Lysenko, the article reviews scientific and research activities of archaeologists, their many years of selfless, purposeful work to study the origins of the Belarusian statehood, to preserve historical and cultural heritage and to educate people about the most remarkable events of the national history.

Keywords: Archeology, historical and cultural heritage, Belarusian statehood, historical research, museum, national treasure.

Сучасная інфармацыйная прастора перагружана негатыўнымі матэрыяламі, якія не спрыяюць фарміраванню станоўчых эмоцый у людзей, каб атрымліваць асалоду ад дасягненняў суайчыннікаў у галіне культуры і навукі, сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Паглыбленасць грамадства ў інфармацыйны хаос выклікае рэзкае падзенне магчымасцей дакладнай ацэнкі чалавекам грамадскіх падзей, якія б адпавядалі аб'ектыўнаму развіццю грамадска-палітычнай сітуацыі. Агульнавядома, прыродная сутнасць чалавека – духоўнасць, якая з'яўляецца яго выключным феноменам. Менавіта духоўны светапогляд чалавека, яго грамадзянскія ўсведамленні ў многім фарміруюцца акружэннем людзей.

## ПРА АЎТАРА

КАВАЛЕНЯ Аляксандр Аляксандравіч.

Нарадзіўся ў 1946 годзе ў г. Капылі Мінскай вобласці. У 1975 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага. Працаваў на кафедры гісторыі КПСС Мінскага педінстытута. З 1983 па 1991 год быў членам Рэспубліканскага каардынацыйнага савета па вырашэнні праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. З 1996 года – загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. З кастрычніка 2004 года – дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі. З 2009 года – акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.

Акадэмік (2021), доктар гістарычных навук (2000), прафесар (2004).

Аўтар больш як 300 навуковых і навукова-педагагічных прац, у тым ліку васьмі манаграфій і 14 адукацыйна-метадычных дапаможнікаў.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі.



П.Ф. Лысенка на месцы раскопу старажытнага Бярэсця. Фота А. Гладышчука, 1981 год

Жыццёвы лёс падарыў мне магчымасць сустрэцца з многімі выбітнымі асобамі: грамадскімі дзеячамі, вучонымі, паэтамі і пісьменнікамі, мастакамі, кіраўнікамі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, рабочымі і будаўнікамі. З асаблівай удзячнасцю ўспамінаю не проста сустрэчу з вучоным, доктарам гістарычных навук, прафесарам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі Пятром Фёдаравічам Лысенкам, а і нашу сумесную працу ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ў 2004–2020 гадах.

Летам 2004 года адбылася сустрэча аўтара артыкула з былым дырэктарам Інстытута гісторыі П.Ц. Петрыкавым і акадэмікам М.А. Барысевічам, якія выказалі прапанову перайсці на працу ў Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Канчатковае рашэнне было прынята пасля настойлівай парады Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М.У. Мясніковіча ўзначаліць Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Ужо ў кастрычніку 2004 года з'явіўся загад аб назначэнні на пасаду выканаўцы абавязкаў дырэктара Інстытута гісторыі. Неверагодная справа, перадпенсійны ўзрост, загадчык кафедры гісторыі педагагічнага ўніверсітэта, у якім вырас прафесійна сам і падрыхтаваў многіх вучняў, распрацаваў і ўкараніў у вучэбны працэс новы курс. А тут новыя людзі, новыя задачы ды шмат праблем і адсутнасць сродкаў на вырашэнне задум і планаў. Але характар не дазваляў апускаць рукі. Больш за тое, важна было не плакацца, а вызначыць навукова-арганізацыйныя праблемы, каб распрацаваць план іх вырашэння. Пачаў са знаёмства з калектывам. Першая размова адбылася з нацыянальнымі карыфеямі – вядомымі ў Беларусі і СССР вучонымі – членам-карэспандэнтам НАН Беларусі Пятром Ціханавічам Петрыкавым, дактарамі навук Георгіем Васільевічам Штыхавым і Пятром Фёдаравічам Лысенкам. Адзначу, размовы ўсялілі ўпэўненасць, праўда, не ва ўсім. Асаблівая настойлівасць гучала з вуснаў Пятра Фёдаравіча: «Будзем сумесна працаваць! Падтрымаем! Вырашым! Дапаможам!» Вядома, такія словы падтрымкі для мяне, новага кіраўніка, каштавалі ўжо нямала. Дзеля справядлівасці неабходна зазначыць, што сапраўды – і дапамагалі, і раілі, і падтрымлівалі.

Варта асобна падкрэсліць тую акалічнасць, што сустрэчы і размовы з вядомым археолагам П.Ф. Лысенкам заўсёды былі няпростымі. Талент, глыбокая эрудыцыя, бясконцая адданасць любімай справе, перакананасць у вырашэнні навуковай праблемы з'яўляліся рухавіком яго планаў і задум. Ён жыў дзеля навукі, ніколі ні перад кім не пасаваў, быў сабраны і заўсёды гатовы расказаць, даказаць і адстаяць важную ідэю. Пётр Фёдаравіч быў адкрыты для дыскусій, заўсёды ўважліва выслухоўваў довады апанентаў, адстойваў свой пункт гледжання, а затым прымаў рашэнне.

Ён быў сапраўдны вучоны-археолаг. Неаднойчы прыходзілася разам з ім знаходзіцца ў раскопе. Гэта былі ўрокі археалагічных навуковых даследаванняў. Заўсёды здзіўлялі яго глыбокія веды. Здавалася, што ён чытае зямлю, яе пласты і праслойкі, каб дасягнуць мацерыка. Асцярожна, нават замілавана, адносіўся да выяўленых артэфактаў, каб не парушыць іх гістарычную першааснову і навуковую каштоўнасць, і патрабаваў таго ж ад калег. Затым ажыццяўлялася камеральная апрацоўка і навуковыя высновы. Пётр Фёдаравіч пастаянна вучыў: каб рабіць навуковыя заключэнні, кожны археолаг павінен валодаць не толькі асновамі кансервацыі арганічных, гліняных, каменных і металічных матэрыялаў, але і мець шырокія веды па палеазаалогіі, антрапалогіі, мовазнаўстве, этнаграфіі, палеаграфіі, сфрагістыцы, нумізматыцы, геральдыцы. Ведаць асновы

металаапрацоўкі, ювелірнай і ганчарнай спраў, мець уяўленні аб апрацоўцы і вырабе рэчаў са скуры, косткі, дрэва, тканіны і інш. Толькі шырока падрыхтаваны вучоны-археолаг здольны мець сваё меркаванне, аргументавана яго адстойваць, абапіраючыся на логіку, а не эмоцыі. Менавіта такімі прафесійнымі якасцямі валодаў Пётр Фёдаравіч.

Я быў зацікаўленым прыхільнікам развіцця археалагічнай навукі, яскрава ўяўляў многія праблемы, асабліва слабае і адсталае навукова-тэхнічнае абсталяванне археолагаў, адсутнасць металадэтэктараў, сродкаў падводнай археалогіі і інш. Менавіта дзеля абуджэння навуковага і грамадскага інтарэсу да археалагічных даследаванняў было прынята рашэнне аб адкрыцці ў Інстытуце гісторыі археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі. Дзякуючы зацікаўленай падтрымцы Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі М.У. Мясніковіча і актыўнаму ўдзелу вучоных-археолагаў нам удалося ў надзвычай кароткі тэрмін рэалізаваць задуму, якая нарадзілася яшчэ ў сярэдзіне XX стагоддзя. Актыўнымі прыхільнікамі і распрацоўшчыкамі канцэпцыі экспазіцыі і непасрэднымі яе выканаўцамі выступілі дактары навук П.Ф. Лысенка, Г.В. Штыхаў, В.М. Ляўко, А.Г. Калечыц, кандыдаты навук В.В. Даніловіч, М.Г. Жылінскі, В.Л. Лакіза, В.І. Шадыра, А.М. Мядзведзеў. Працавалі апантана, і ўжо ў 2007 годзе, да дня адкрыцця Першага з'езда вучоных Беларусі, музейная навукова-археалагічная экспазіцыя адчыніла дзверы ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Яна і сёння з'яўляецца брэндам інстытута, дзе прэзентуюцца навуковыя даследаванні беларускіх археолагаў і арганізуюцца вучэбныя заняткі з вучнямі і студэнтамі.

Праяўлены клопат аб навукова-даследчай працы археолагаў спрыяў развіццю іх даследаванняў. Вядучыя спецыялісты пастаянна раіліся і ставілі пытанні аб актывізацыі вывучэння цэлага шэрагу археалагічных помнікаў. Асаблівую актыўнасць праяўляў Пётр Фёдаравіч. Ён настойліва выказваў думку аб далейшым працягу вывучэння старажытнай гісторыі Турава, Пінска, Слуцка, Мінска. Менавіта яго навуковыя ініцыятывы садзейнічалі актывізацыі нашага супрацоўніцтва. У меру магчымасцей я імкнуўся аказваць падтрымку ў рэалізацыі многіх ідэй.

Трэба адзначыць, што ў навукова-даследчых планах і ў паўсядзённай працы Пятра Фёдаравіча не праяўлялася асабістая карысць. Галоўнай мэтай, якая рухала яго даследаванні і аб чым мы пастаянна вялі навуковыя спрэчкі, было жаданне паглыбіцца ў гісторыю продкаў, раскрыць і паказаць высокі духоўна-культурны ўзровень жыцця і вартасць іх грамадска-палітычных аб'яднанняў. П. Лысенка развіваў нацыянальную археалагічную навуку, папулярызаваў і захоўваў навукова-практычныя дасягненні нацыянальнай гістарычнай навукі. Ды і час патрабаваў. Беларусь атрымала права самастойнага нацыянальна-дзяржаўнага развіцця. У гэты няпросты перыяд гістарычная навука абавязана была даказваць і замацоўваць у свядомасці грамадства, што нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва не з'яўлялася для беларусаў выпадковай справай. Важна было, абапіраючыся на археалагічныя матэрыялы, штодзённа паказваць не толькі прысутнасць нашых продкаў на заходніх землях, але і высокі ўзровень арганізацыі іх грамадска-палітычнага жыцця. Менавіта выяўленыя археалагічныя матэрыялы ў Полацку, Бярэсці, Тураве, Менску і многіх іншых гістарычных помніках сталі важнай фактычнай асновай для навуковага абгрунтавання нацыянальнай дзяржаўнасці. Адзначу, што нашы навуковыя і грамадзянскія думкі супадалі, а гэта ў значнай ступені садзейнічала поспеху рэалізацыі навуковых праектаў і адстойванню нацыянальна-дзяржаўных прыярытэтаў.

Некалькі слоў хацелася б сказаць пра рабочы кабінет Пятра Фёдаравіча, у якім было мала месца для прыёму гасцей і вучняў. Ад падлогі і да столі па ўсім пакоі – археалагічныя артэфакты, макеты, схемы, карты, малюнкі, безліч кніг, фотаздымкі, клей і фарбы. Кабінет больш нагадваў археалагічную рэстаўрацыйную майстэрню. Госцю патрэбна было шукаць месца, куды прыхіліцца, каб не парушыць працоўны «парадак».

Неяк у пачатку дырэктарскай дзейнасці я па сваёй недасведчанасці аднойчы заўважыў: «Пётр Фёдаравіч! Думаю, што ў вашым кабінеце неабходна зрабіць рамонт, каб прафесар меў дастойнае і ўтульнае месца працы». Адказ прагучаў нечаканы: «Аляксандр Аляксандравіч, зробіце гэта пасля мяне». У гэтым яго творчым беспарадку быў толькі яму вядомы парадак сапраўднага вучонага. На кожнае пытанне госця гаспадар праз хвіліну знаходзіў адказ, неабходны артэфакт альбо дакумент, які пераканаўча пацвярджаў глыбіню яго наву-



На месцы старажытнага тураўскага храма, разбуранага ў 1230 годзе ў час землетрасення, узведзены шкляны купал. 2005 год



Руіны царквы на Замкавай гары Турава выяўлены падчас археалагічных раскопаў пад кіраўніцтвам П.Ф. Лысенкі і Н.М. Дубіцкай

ковай дасведчанасці па той ці іншай праблеме. А яго навуковай упартасці наогул можна было пазайздросціць. Гэта, дарэчы, тое, чаго нестае маладым вучоным сёння. Для Пятра Фёдаравіча аўтарытэтам быў толькі яго вялікасць факт. Сёння памяць аб яго месцы працы захоўваецца, аб чым сведчыць і прыгожая шыльда «Пакой імя Пятра Фёдаравіча Лысенкі».

Зробленае намі адступленне характарызуе не толькі апантаную дзейнасць Пятра Фёдаравіча, але і многіх айчынных вучоных-гісторыкаў. Неабходна падкрэсліць, што мы не чакалі ўказанняў. Паводле ініцыятывы гісторыкаў быў не толькі распрацаваны шэраг навуковых канцэпцый развіцця гістарычнай навукі, але і наладжана мэтанакіраваная навукова-даследчая праца па практычным выкананні праектаў, у якіх самы актыўны ўдзел прымаў Пётр Лысенка. Так з'явілася праграмная форма арганізацыі навуковых даследаванняў, якая і сёння аб'ядноўвае вядучых вучоных-гуманітарыяў краіны, дазваляе кансалідаваць навуковыя кадры на найбольш актуальных праблемах, аператыўна і эфектыўна вырашаць многія праекты. У мэтах выразнай ілюстрацыі і адстойвання гісторыі фарміравання нацыянальнай дзяржаўнасці вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі за даволі кароткі тэрмін падрыхтавалі і выдалі дзясяткі навуковых прац, якія асвятляюць розныя перыяды гісторыі беларускага народа. Сярод іх неабходна назваць дзяржаўна значныя фундаментальныя працы: «Вялікі гістарычны атлас Беларусі» ў 4 тамах; «Археалогія Беларусі: энцыклапедыя» ў 2 тамах; «История белорусской государственности» ў 5 тамах; «Республика Беларусь – 25 лет созидания и свершений» у 7 тамах; вучэбны комплекс «Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце Другой сусветнай вайны» з пяці дапаможнікаў і інш.

Названыя і многія іншыя працы з'яўляюцца важнай і трывалай асновай адстойвання інтарэсаў беларускага народа як носьбіта і творцы свайго самабытнага лёсу і нацыянальнай дзяржаўнасці. Абапіраючыся на працы папярэднікаў, навейшыя дасягненні археалагічнай навукі, з навуковых пазіцый выкарыстоўваючы гістарычныя, геаграфічныя і этнаграфічныя падыходы, у іх разглядаецца складаны працэс зараджэння і фарміравання беларускага этнасу і станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Творчае асэнсаванне спадчыны дазволіла пераадолець традыцыйныя вялікадзяржаўныя погляды на гісторыю Беларусі, прапанаваны новыя падыходы да даследавання «старых праблем» з пазіцый тэарэтычнага даследавання і развіцця грамадскага ладу. Пераканаўча паказана гісторыя фарміравання этнасу, раскрыта непахіснае права беларускага народа на пабудову ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці. У названых фундаментальных працах відаць, што падмурак

нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ствараўся многімі пакаленнямі продкаў беларусаў, якія спрадвеку імкнуліся быць гаспадарамі на сваёй зямлі, жыць сваім розумам, не падпарадкоўваючыся ўказцы звонку.

Дырэкцыя Інстытута гісторыі і вядучыя вучоныя значна актывізавалі працу, накіраваную на забеспячэнне практычнай выніковасці археалагічных даследаванняў, музеефікацыі выяўленых матэрыялаў, ажыццяўлення рэстаўрацыйных работ на многіх гістарычных помніках. Пад кіраўніцтвам Пятра Фёдаравіча было падрыхтавана навуковае абгрунтаванне і распрацавана арыгінальная канцэпцыя стварэння гістарычна-культурнага комплексу «Замкавая гара» ў Тураве. Мы неаднойчы яе абмяркоўвалі, уносілі ўдакладненні, імкнучыся надаць характэрную арыгінальнасць. Вядома, увесь цяжар навукова-тэарэтычнай працы ўзяў на сябе П.Ф. Лысенка, які многія гады ажыццяўляў археалагічныя даследаванні ў Тураве, меў вялікі вопыт музеефікацыі ўнікальнага археалагічнага помніка ў Бярэсці.

Варта падкрэсліць, што ў нашым канцэптуальным бачанні мы зыходзілі з таго, што ў грамадскае асяроддзе незалежнай Беларусі важна было прыўносіць візуальныя матэрыяльныя доказы глыбінных вытокаў фарміравання беларускай нацыі і дзяржаўнасці. Толькі ўспамінамі і друкаванымі працамі турыста-абывацеля не здзівіць. Патрэбна нешта такое, каб кожны грамадзянін Беларусі і замежны турыст не толькі пачулі расказ, але ўбачылі, дакрануліся і акунуліся ў гістарычнае мінулае беларусаў. Пасля працяглых дыскусій прапановы былі абагулены і прадстаўлены ў Міністэрства культуры, на пасяджэнне навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Нашы намаганні былі падтрыманы, а распрацаваная канцэпцыя ўхвалена. У 2004 годзе паводле прапановы Прэзідэнта Беларусі А.Р. Лукашэнкі старажытнаму Тураву быў вернуты страчаны статус горада. Менавіта гэтае рашэнне дапамагло разгарнуць маштабную праграму па развіцці малых беларускіх гарадоў.

Неабходна адзначыць, што Пётр Фёдаравіч невыпадкова прыйшоў да высновы, што Тураў з'яўляецца важным гісторыка-палітычным цэнтрам беларускай зямлі. Папярэдне ён не проста старанна вывучаў летапісныя матэрыялы Тураўскай зямлі і апублікаваныя даследаванні папярэднікаў, імкнучыся прасачыць палітычныя з'явы і падзеі, каб паглыбіцца і зразумець гісторыю дамангольскага нашэсця на Русь, вынікам яго карпатлівай працы з'ўляліся шматлікія артыкулы ў навуковых выданнях і манаграфічныя даследаванні *[1; 2; 3; 4; 5; 6]*. Ужо ў 1974 годзе свет убачыла манаграфія «Города Туровской земли», у якой на падставе пісьмовых і археалагічных матэрыялаў асэнсоўваюцца пытанні фарміравання і развіцця старажытных гарадоў на тэрыторыі Тураўскай зямлі.

**Археалагічны музей «Бярэсце» ў 1982 годзе адкрылі дзякуючы намаганням П.Ф. Лысенкі, які звяртаўся па падтрымку нават да Старшыні Савета Міністраў СССР А.М. Касыгіна**



Абапіраючыся на даследаванні папярэднікаў, ён здолеў выявіць і пашырыць звесткі не толькі пра Тураў, але і пра Пінск, Давыд-Гарадок, Слуцк, Бярэсце, Клецк, Рагачоў, Мазыр, Капыль, Чартарыйск, Нобель, Дубровіцы і Сцяпань. У яго працах разглядаецца іх тапаграфія, планіроўка, забудова, эканамічныя і культурныя сувязі, заняткі насельніцтва. Вядома, не ўсе яны аднолькава падрабязна апісваюць жыццядзейнасць нашых продкаў, але гэта была першая спроба аўтара комплексна асэнсаваць і ахарактарызаваць эканамічнае і культурнае развіццё паўднёва-заходняга рэгіёна Беларусі.

На маім рабочым стале і сёння яго кнігі, ёсць з подпісам аўтара. Напісанне артыкула патрабавала ўзнаўлення некаторых старонак нашага супрацоўніцтва, я зноў звяртаўся і перачытваў яго шматлікія працы, у якіх былі выкладзены многія навуковыя ідэі. Паглыбленае знаёмства з яго даследаваннямі яскрава сведчыць, што Пётр Фёдаравіч цікавіўся і дэталёва аналізаваў не толькі археалагічныя матэрыялы, але і прыродна-кліматычныя асаблівасці рэгіёна, якія аказвалі адбітак на фарміраванне характэрных рыс мясцовых жыхароў і іх сацыяльна-эканамічнае жыццё, стан ваенна-абарончых збудаванняў і інш.

Прычым у сваіх працах аўтар аддае належнае тым, з кім ён працаваў і разам асэнсоўваў велізарны старадаўні пласт, што яскрава характарызуе яго навуковую карэктнасць і грамадзянскія якасці. Для прыкладу прывядзём некалькі радкоў з яго кнігі «Сказание о Турове»: «Книга написана на основе изучения древнейших летописей, содержащих краткие, отрывочные и крайне скудные упоминания о древнем Турове. Основные сведения, несомненно, получены в ходе археологического изучения древнего туровского городища. Работы проводились на протяжении многих полевых сезонов, начиная с 1961 года. В них участвовали Т.Н. Коробушкина, Е.Г. Коробушкин, Б.В. Миролюбов, В.В. Шаблюк, А.А. Метельский, В.В. Поздняков, О.В. Иов, Н.Н. Дубицкая, Т.Г. Малюченко, Д.Ю. Марухина, Ф.П. Лысенко. Я искренно благодарен за участие в работах бригаде гомельских археологов Ю. Ободенко, Н.И. Бруевича. В работе постоянно принимали участие ученики старших классов туровских школ. Нам оказывали поддержку председатели Туровского исполнительного комитета Н.Н. Артюшко, В.Г. Королец, научный сотрудник Туровского краеведческого музея П.А. Щекотович».

Далей ён працягвае: «Основная обязанность и ответственность – ознакомить с результатами исследований посетителей древнего Турова и читателей этой книги лежит на мне как исследователе этого уникального памятника. Как это удалось автору – судить читателю. Я же могу только просить о снисходительном отношении. Исследование древнего Турова не завершено и будет продолжаться. Будут новые открытия и новые книги» *[6, с. 5–6]*. Вось гэтыя радкі не толькі перадаюць маштабнасць даследаванняў, але і яскрава характарызуюць вучонага-грамадзяніна.

Дзякуючы шматгадоваму і паглыбленаму вывучэнню гісторыі Тураўскага княства аўтар, абапіраючыся на шматлікія матэрыялы археалагічных даследаванняў і асэнсаванне летапісных крыніц, сцвярджаў, што старажытнае Тураўскае княства было адным з найбольш аўтарытэтных у сістэме княстваў старажытнай Русі і адным з важных цэнтраў фарміравання беларускай дзяржаўнасці і развіцця беларускай культуры. У 1005 годзе ў Тураве была заснавана адна з першых на Русі епіскапій. Падчас археалагічных раскопак быў выяўлены падмурак храма XII стагоддзя, які не саступаў па велічыні Кіеўскай і Наўгародскай Сафіям. Пераканаўчым доказам з'явіліся маштабныя археалагічныя раскопкі, якія праводзіліся ў 2005 годзе пад кіраўніцтвам П.Ф. Лысенкі і Н.М. Дубіцкай. Выяўлены руіны царквы, якая была разбурана падчас землетрасення 1230 года.

У 2005 годзе пры падтрымцы Гомельскага аблвыканкама была ажыццёўлена ідэя Інстытута гісторыі, якая прапаноўвала правесці дасканалыя археалагічныя даследаванні, каб расчысціць руіны храма XII стагоддзя, а затым перакрыць раскоп павільёнам. Варта адзначыць, што такое рашэнне было прынята дзякуючы глыбокаму і аўтарытэтнаму выступленню Пятра Фёдаравіча, у якім адчувалася не проста навуковая глыбіня разумення праблемы, але і нацыянальна-дзяржаўнае абгрунтаванне палітычнай значнасці будаўніцтва гісторыка-культурнага цэнтра старажытнага Палесся. Сапраўды, багацце гістарычных помнікаў у Тураве і ваколіцах пераканаўча даказваюць яго значэнне ў старажытнай Русі, роўных якому няма на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі.

Неабходна звярнуць увагу на тую акалічнасць, што вучоныя Інстытута гісторыі НАН Беларусі зрабілі многае, каб захаваць і прадставіць сучаснікам гістарычную спадчыну Тураўскага краю. На жаль, не ўсе нашы планы па рэканструкцыі тураўскага дзяцінца былі рэалізаваны. Нязбытнай марай Пятра Фёдаравіча засталася пабудова абарончай сцяны па перыметры дзяцінца. Нагадаем, што гэта адзіны старажытны горад на тэрыторыі Беларусі, які захоўвае свае тапаграфічныя асаблівасці. У нашых задумах была ідэя пабудовы горада майстроў, у якім дзейнічалі бы майстэрні ткацкай і ганчарнай вытворчасці, домікі рыбака і цесляра па вытворчасці прыпяцкіх чаўноў і іншых рамеснікаў.

Летам 2005 года наведаў Тураў, каб пазнаёміцца з ходам археалагічных даследаванняў, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам Пятра Фёдаравіча. Мы размаўлялі аб будучай экспазіцыі, і я запытаў у Пятра Фёдаравіча, як яму ўдалося адкрыць месцазнаходжанне Бярэсця. Каб атрымаць адказ і наблізіцца да фінальнай часткі аповеда, спатрэбілася некалькі вечароў. Першая спроба выявіць месца гарадской забудовы была зроблена яшчэ ў 1961 годзе, разам з яго настаўнікам, вядомым расійскім археолагам В.В. Сядовым. Спроба аказалася беспаспяховай. Тым не менш малады навуковец Пётр Лысенка не апусціў рукі, а паглыбіўся ў вывучэнне пісьмовых крыніц, старажытных карт, запісак падарожнікаў, асэнсаванне даследаванняў мясцовых краязнаўцаў. Вывучэнне такога шырокага комплексу крыніц дазволіла маладому археолагу ў 1964 годзе выказаць думку, што месца размяшчэння Бярэсця магло знаходзіцца на мысе пры зліцці левага рукава ракі Мухавец і Заходняга Буга. Спатрэбілася яшчэ чатыры гады, каб маці-гісторыя Кліо прыадчыніла свае таямніцы.

Прыпыніць расказ Пятра Фёдаравіча было немагчыма. Прызнаюся, што не надта імкнуўся перарываць захапляльныя навуковыя сюжэты, якімі ён жыў і з запалам імкнуўся паведаміць. Для мяне было важным зразумець глыбінную сутнасць праблемы, каб затым яе адстойваць у асяроддзі мясцовых і абласных улад. Прычым археалагічныя гіпотэзы часта перасыпаліся бытавымі замалёўкамі з палявога жыцця археолагаў, цікавых сюжэтаў было шмат. Некалькі вечароў запар ва ўсіх фарбах археалагічнага жыцця ён апісваў творчую эпапею, якая разгортвалася ў працэсе археалагічных даследаванняў Бярэсця. Патрэбны асобны нарыс, каб



**Пётр Лысенка – удзельнік рэспубліканскай навукова-творчай экспедыцыі «Дарога да святыняў» – з вучаніцамі Валынскай сярэдняй школы Верхнядзвінскага раёна, 2003 год**

узнавіць усе яго прыгоды. «Нарэшце, – працягваў Пётр Фёдаравіч, – калі ўжо скончыліся фізічныя сілы, я лёг у цень разлапістай таполі і нават прыснуў». Менавіта тады яму прыснілася месца будучага раскопу. А высокая навуковая кваліфікацыя і працоўная ўпартасць Пятра Лысенкі забяспечылі станоўчы вынік. Падчас раскопак, што вяліся з 1969 года на плошчы 1800 квадратных метраў, знайшлі дзясяткі драўляных пабудоў, якія добра захаваліся. Адкапалі нават вулічныя маставыя, агароджы, шматлікія прадметы матэрыяльнай культуры. Над гэтым раскопам, які складае аснову экспазіцыі музея, узвялі спецыяльны павільён памерам 40 на 60 метраў: у наведвальнікаў з'явілася магчымасць знаёміцца са славянскімі пабудовамі і побытам нашых продкаў, што жылі ў канцы першага, пачатку другога тысячагоддзя.

Вядома, што многія з вялікіх адкрыццяў у гісторыі чалавецтва былі зроблены не акадэмічнымі навукоўцамі-падзвіжнікамі, а самавучкамі, авантурыстамі-ўдачнікамі, якія не мелі акадэмічных ведаў, аднак наперакор лёсу былі гатовы рызыкаваць жыццём, каб ажыццявіць мэту. Малады вучоны-археолаг не падзяляў такі падыход. Ён мэтанакіравана дабіваўся дасягнення пастаўленай мэты. У студзені 1975 года Пётр Фёдаравіч звярнуўся нават да Старшыні Савета Міністраў СССР А.М. Касыгіна, каб ён падтрымаў будаўніцтва археалагічнага музейнага комплексу «Бярэсце».


«Першы беларускі буквар» – самшытавы грэбень знойдзены ў 1970 годзе падчас раскопак старажытнага Бярэсця

Былі пераадолены ўсе складанасці, і музей «Бярэсце» адкрылі ў 1982 годзе. За гэты час яго наведала больш за тры мільёны чалавек. Тым не менш і сёння некаторыя пытаюцца, якая карысць ад такіх музеяў? Для Беларусі – маладой суверэннай дзяржавы – яны маюць не толькі выключнае сведчанне духоўна-культурнага багацця беларускага народа, але і палітычны сэнс. Многія артэфакты пераканаўча пацвярджаюць глыбінную гісторыю фарміравання беларускага этнасу і яго нацыянальнай дзяржаўнасці. Напрыклад, у 1980 годзе на Міжнародным кангрэсе па славянскай археалогіі Пётр Фёдаравіч Лысенка абверг гіпотэзу польскіх гісторыкаў пра тое, што Бярэсце заснавалі польскія плямёны. Першым аргументам сталі пацеркі са срэбнымі шарыкамі ўнутры, якія вырабляла толькі адно племя – дрыгавічы, другім – свінцовая падпісная пячатка тураўскага князя. І галоўным доказам выступіў самшытавы грэбень з кірыліцай, «старажытны буквар». Як вядома, палякі кірыліцай не карысталіся, гэта дазволіла паставіць кропку ў навуковых спрэчках *[7]*.

У манаграфіі «Открытие Берестья» П.Ф. Лысенка пісаў, што гэта быў «вынутый из слоя грязный и запачканный самшитовый гребень с обломанными с одной стороны зубьями», «по-видимому, он служил „букварем" не для одного поколения маленьких берестян». На ім выразана 13 літар алфавіта-кірыліцы. На адным баку шэсць, а на другім сем літар. Гэты грэбень – найстарэйшы і адзіны «падручнік» па навучанні грамаце на тэрыторыі Беларусі.

Прыродны дар Пятра Лысенкі праяўляўся не толькі ў навуковых даследаваннях. Ён быў удзельнікам мастацкай самадзейнасці інстытута і з захапленнем выконваў народныя песні. Яго голас зачароўваў. Патрэбна адзначыць, што Пётр Фёдаравіч быў таленавітым вучоным і выдатным настаўнікам моладзі, актыўным прапагандыстам навуковых ведаў. Ён пастаянна імкнуўся даводзіць да шырокага кола чытачоў адкрыцці археолагаў, выступаў на канферэнцыях і ў друку, публікаваў артыкулы і манаграфічныя працы.

Пётр Фёдаравіч Лысенка са сваім сябрам Сцяпанам Сцяпанавічам Лаўшуком з'яўляліся нязменнымі арганізатарамі і ўдзельнікамі штогадовых навукова-асветніцкіх экспедыцый «Дарога да святыняў». «Асветніцкія выступленні лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, доктара гістарычных навук, прафесара Пятра Фёдаравіча Лысенкі, – адзначае Яўген Пясецкі, – з аднолькавым поспехам праходзілі і ў гарадах, і ў вёсках. Ён заўжды меў мэту не толькі данесці новыя веды пра далёкае мінулае роднага краю, але і пераканаць слухачоў, што гэтая гісторыя вартая займаць пачэснае месца…» *[8]*. І не толькі ў гісторыі агульнаславянскай, але і сусветнай.



Прафесар П.Ф. Лысенка: сканцэнтраванасць і засяроджанасць, гатоўнасць да навуковай дыскусіі. Такім ён застаўся ў памяці калег

За гады працы экспедыцыі «Дарогі да святыняў» з Благадатным агнём ад Гроба Гасподняга ўдзельнікі праехалі 34 400 кіламетраў, пешымі хрэснымі хадамі прайшлі 661 кіламетр, было асвечана Благадатным агнём 655 храмаў, капліц і манастыроў. Сярод тых, хто ініцыіраваў і падтрымліваў правядзенне экспедыцыі, былі вядомыя дзеячы беларускай культуры і навукі, у іх ліку член-карэспандэнт НАН Беларусі Сцяпан Лаўшук і прафесар Пётр Лысенка. У верасні 2020 года адбылася XXVII духоўна-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», якая праходзіла ўжо без удзелу Пятра Фёдаравіча.

На жаль, выдатны вучоны, высакародны грамадзянін і чалавек пакінуў нас, але засталася велізарная творчая спадчына, якая будзе служыць новым пакаленням беларускага грамадства. Не перабольшу, калі адзначу, што Пётр Фёдаравіч – асоба нацыянальнага ўзроўню, грамадзянін, чыё прозвішча разам з імёнамі нацыянальных асветнікаў павінна быць упісана ў Пантэон Нацыянальнай Славы беларускага народа. Ён ахвяраваў жыццё навуцы, каб даказаць не толькі сабе, але ўсяму беларускаму народу і сусветнаму грамадству, што ўжо ў канцы першага – пачатку другога тысячагоддзя на паўднёва-заходніх рубяжах беларускай зямлі існавалі гарады-крэпасці Бярэсце і Тураў, якія абаранялі нашых продкаў ад нашэсця заходніх агрэсараў.

Сёння без навуковых прац Пятра Фёдаравіча Лысенкі цяжка, нават немагчыма, уявіць не толькі гісторыю Палескага краю, але і ўсяго беларускага народа. Старажытныя курганы ў Тураве, Бярэсці, Пінску, Слуцку, Давыд-Гарадку, Клецку, Рагачове, Мазыры, Мінску будуць памятаць яго руплівыя навуковыя адносіны да гістарычнай спадчыны. Засталіся нашчадкам і старажытныя музейныя экспазіцыі ў Брэсце і Тураве – унікальныя помнікі гісторыі беларускага народа і памяць пра яго высакароднага сына, выдатнага вучонага-археолага.

***Фота БЕЛТА і з адкрытых крыніц***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 25.11.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Штыхов Г.В., Лысенко П.Ф. Древнейшие города Белоруссии / Г.В. Штыхов, П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1966. – 87 с.
2. Лысенко, П.Ф. Города Туровской земли / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1974. – 200 с.
3. Лысенко, П.Ф. Берестье / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 399 с.
4. Лысенко, П.Ф. Дреговичи / П.Ф. Лысенко; под ред. В.В. Седова. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 244 с.
5. Лысенко, П.Ф. Древний Пинск XI–XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – Минск: БелАДИ, 1997. – 189 с.
6. Лысенко, П.Ф. Сказание о Турове / П. Ф. Лысенко. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Беларуская навука, 2007. – 118 с.
7. Яскевіч, С. Інтэрактыў на службе ў даўніны / С. Яскевіч // Звязда. – 2019. – 8 кастрычніка. – С. 7.
8. Пясецкі, Я. Гістарычны пласт Пятра Лысенкі / Я. Пясецкі // Звязда. – 2020. – 25 сакавіка. – С. 14.